# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

ЧАЦВЕР
17 верасня
1993 года
№ 12(1699)


ЯК СПРАВЫ?

## РЭФОРМЫ Ў АДУКАЦЫІ ІДУЦЬ НЕ ЛЯГЧЭЙ, ЧЫМ У ЭКАНОМІЦЫ

*Гэта толькі на першы погляд здаецца, што кожны навучальны год цалкам паўтарае папярэдні. Асабліва хапае новаўвядзенняў у цяперашні час, калі на стан народнай адукацыі актыўна ўплываюць перамены ў палітыцы і эканоміцы. Апошнія навіны універсітэцкага жыцця сталі прадметам размовы карэспандэнта «Беларускага універсітэта» з намеснікам начальніка вучэбна-метадычнага аддзела А. М. БАРАНАВЫМ.*

**— Анатоль Мікалаевіч, БДУ — адна з галоўных ВНУ рэспублікі. Зразумела, ён не стаіць убаку ад стварэння новай канцэпцы сістэмы вышэйшай адукацыі на Беларусі...**

— Універсітэт актыўна ўдзельнічае ў гэтым працэсе. Ужо ў канцы бягучага навучальнага года мы павінны прадставіць ў Міністэрства народнай адукацыі распрацоўкі кваліфікацыйных характарыстык новых праграм, вучэбных планаў, з'арыентаваных на двухузроўневую сістэму адукацыі па выкладаемых ва універсітэце спецыяльнасцях. Работа гэта ўжо завяршаецца.

Значная ўвага ў канцэпцыі новай сістэмы вышэйшай адукацыі будзе надавацца вывучэнню гуманітарных дысцыплін. Іх колькасць плануецца давесці да 35 працэнтаў ад усяго вучэбнага плана. Улічваючы, што адразу зрабіць такі рэзкі пераход немагчыма, універсітэт у гэтым годзе абраў сабе за мэту дасягнуць 25 працэнтаў. Хаця сярод факультэтаў, асабліва прыродазнаўчых, ёсць і такія, што непрыязна сустрэлі гэтае новаўвядзенне. Найбольш праблем узнікла з факультэтам радыёфізікі і электронікі. Як бачым, рэформы ў адукацыі ідуць не лягчэй, чым у палітыцы і эканоміцы.

**— Прыгадаем, дарэчы, што з 1 верасня набылі юрыдычную сілу некаторыя палажэнні закона «Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь». Якім чынам адбілася гэта на вучэбным працэсе розных факультэтаў?**

— Вы ж ведаеце, што на многіх факультэтах не першы год існуюць беларускамоўныя патокі. А факультэт журналістыкі ўжо зараз можна лічыць цалкам беларускамоўным. Хутка да яго далучыцца і гістфак.

**— Нельга не закрануць і вось такі момант: многія выкладчыкі ўсё больш хвалююцца за свой далейшы лёс...**

— І тут ёсць над чым задумацца. Колькасць студэнтаў ва універсітэце пастаянна змяншаецца. І калі раней гэта адбывалася толькі за кошт «адсеяных» на працягу пяці гадоў вучобы (лічбы, зазначу, таксама не малая), то цяпер трэба ўлічваць і той факт, што скарачаецца колькасць паступаючых. І скарачэнняў выкладчыкаў тут ніяк не пазбегнуць.

Але гэта не адзіная прычына. Сёлета мы вымушаны былі скараціць больш як на трэць колькасць штатных адзінак на кафедры айчыннай і сусветнай гісторыі з-за таго, што рэзка панізілася цікаўнасць факультэтаў да выкладаемых супрацоўнікамі кафедры дысцыплін.

Аднак у вопытных прафесіяналаў і майстроў сваёй справы няма прычын для хвалявання — універсітэцкае кіраўніцтва робіць усё магчымае, каб захаваць выкладчыцкі састаў.

Гутарыў
Аляксандр ЮРЫН.

НАДОЕЧЫ

## БЕГАЙЦЕ, ПЛАВАЙЦЕ... ПАКУЛЬ БЯСПЛАТНА

*Традыцыйная сустрэча з першакурснікамі ў гэтым годзе, пэўна, прынесла задавальненне трэнерам спортклуба і выкладчыкам кафедры фізвыхавання: пад час агульнага зніжэння інтарэсу моладзі да масавых мерапрыемстваў актавая зала універсітэта ў прызначаны тэрмін была проста перапоўнена прыхільнікамі спорту.*

Можна спадзявацца, што сярод іх былі і тыя, хто падтрымае гонар універсітэта не толькі на рэспубліканскай, але і на міжнароднай арэне.

Як зазначыў ва ўступным слове старшыня спартыўнага клуба **Віктар Іванавіч ПЯТРОЎСКІ**, Белдзяржуніверсітэт заўсёды меў сваіх чэмпіёнаў. І сёння імёны такіх майстроў, як Камандар Маджыдаў, Сяргей Дземяшкевіч, Віктар Булат, добра вядомы ў сусветным спорце. Галоўнае ж, на што звярнуў увагу В. І. Пятроўскі, гэта наяўнасць добрых трэнераў, без якіх спартсмены не становяцца чэмпіёнамі.

Зразумела, не кожны першакурснік спіць і ў сне бачыць алімпійскія медалі. Для тых, хто займаецца спортам проста для сябе, універсітэт прапануе зусім нядрэнную базу: стадыён, басейн, спартыўны комплекс і шматлікія спартыўныя залы.

Спартыўны клуб праводзіць заняткі па такіх відах спорту, як футбол, баскетбол, плаванне, лёгкая і цяжкая атлетыка, армрэслінг, дзюдо, самба, гімнастыка, фехтаванне, шашкі і шахматы. Будзе працаваць секцыя ўсходніх адзінаборстваў, заняткі па турызму і альпінізму.

*Спяшайцеся карыстацца ўсім гэтым. Хто ведае, можа ўжо заўтра трапіць туды можна будзе толькі за грошы.*

*Алесь СПАРТЫУНЫ.*

ПРЫКМЕТЫ РЫНКА

## ЗАПЛАЦІ — І ВУЧЫСЯ

*Сёлета нават няўдачнікі, якія не прайшлі па конкурсу, атрымалі шчаслівую магчымасць вучыцца ва універсітэце. Праўда, за адпаведную плату — 450 тысяч за першы год навучання.*

Зусім немалая нават па сённяшніх мерках аплата не перашкодзіла набраць на юрфак больш сямідзесяці чалавек звыш плана, каля 20 — на журфак, 13 — на біялагічны факультэт, 27 — на гістарычны.

Прадугледжана, зразумела, і магчымасць пераўтварэння «платнікаў» у звычайных студэнтаў. Для гэтага патрэбна мець выдатныя адзнакі і пачакаць, пакуль за кошт выбыўшага ў «акадэмку» ці выключанага з універсітэта суседа па аўдыторыі вызваліцца месца.

У СУСЕДЗЯЎ





## ПЫЛ МІНУЛАГА ЗМЫТЫ. ПРЫСЯГАЕМ НА ВЕРНАСЦЬ БАЦЬКАЎШЧЫНЕ

*Галоўная плошча сталіцы пачула словы клятвы на вернасць Радзіме курсантаў Мінскага каманднага і інжынернага вучылішчаў.*

Звярнуўшы ўвагу на важнасць і адказнасць моманту, Станіслаў Шушкевіч выказаў надзею, што курсантам не давядзецца прымяняць свае прафесійныя навыкі на практыцы.

Нагадаем, што ў гэты ўрачысты дзень ішоў дождж. «А дажджу не бойцеся,— сказаў спікер парламента,— няхай дождж змые пыл мінулага!»

Пасля ўскладання вянкоў і мінуты маўчання на плошчы Перамогі гасцей запрасілі на адпачынак у парк імя М. Горкага, дзе была прадстаўлена культурная праграма, падрыхтаваная з ваенным размахам: гасцей частавалі сапраўднай салдацкай кашай.

ВЕЦЕР ВАНДАРВАННЯЎ

## ЗЛЁТ АДБУДЗЕЦЦА ПРЫ ЛЮБЫМ НАДВОР'І

*Турыстычны клуб «Рэха» рыхтуецца да правядзення традыцыйнага, трыццаць пятага па ліку, злёту турыстаў і альпіністаў БДУ. Сёлета ён пройдзе 9—10 кастрычніка пад Аляхновічамі, на рацэ Беразіне.*

Як паведамілі ў турклубе, у праграму злёта ўваходзіць начное арыентаванне, камбініраваная паласа перашкод, адбудуцца дамбайскія гулянкі. Конкурс аўтарскай песні па традыцыі завершыць гэтае штогадовае свята універсітэцкіх турыстаў.

Хто зацікавіўся маючай адбыцца падзеяй, можа атрымаць запрашальны білет і карту месца правядзення злёту 1 кастрычніка з 19 да 21 гадзіны ў спартыўнай зале галоўнага корпуса.

І яшчэ адна навіна для тых, хто лічыць, што «лепей за горы могуць быць толькі горы». 18—19 верасня ў мястэчку Дзянішы пройдуць спаборніцтвы па скалалазанню. Удзельнічаць будуць усе мацнейшыя скалалазы Беларусі. Жадаючыя прыняць удзел у спаборніцтвах могуць звярнуцца за дадатковай інфармацыяй да Аляксандра Максімені па тэл. 49-32-08.

ЛЮСТЭРКА

## Любім — не любім, вучым — не вучым

*Рэчаіснасць такая, што кожнае пакаленне студэнтаў аддае перавагу таму ці іншаму цыклу прадметаў. Памятаеце знакамітае спаборніцтва фізікаў і лірыкаў? Як ні дзіўна, але менавіта ў гэтым годзе яно скончылася б перамогай апошніх. Так-так, у той час, калі прэстыж адукацыі наогул падае, калі квітнеюць «камкі» і развіваецца падазорны бізнес, абітурыенты мэтанакіравана ідуць вучыцца на гуманітарыяў. Якім чынам адбіваецца такая прыхільнасць у вучэбным плане універсітэта па вывучэнню агульнагуманітарных дысцыплін?*

Значна павысіўся апошнім часам інтарэс да вывучэння замежных моў. Аб гэтым сведчаць адпаведныя лічбы па ўсіх факультэтах. Затое ў адносінах да роднай мовы не ўсё так добра, хоць разяваць раток на чужы пірог не след, не паспытаўшы свайго. Пры ўсім тым, што на некаторых прыродазнаўчых факультэтах ужо не першы год існуюць беларускамоўныя патокі, на ФПМІ толькі зусім нядаўна быў, уведзены новы прадмет — «Беларуская тэрміналогія».

Расце жаданне факультэтаў вывучаць філасофію. Цяпер студэнты штудзіруюць не толькі традыцыйных класікаў марксізма-ленінізма, але і лепшых прадстаўнікоў сусветнай філасофіі.

Павышаецца колькасць гадзін на авалоданне эканамічнымі дысцыплінамі. Рынак дыктуе свае ўмовы.

На жаль, не радуюць адносіны факультэтаў да культуразнаўчых дысцыплін. Гадзіны, адведзеныя на іх вывучэнне, хутчэй, чыста сімвалічныя. Здзіўляе, што многія з факультэтаў наогул адмаўляюцца ад сацыяльна-псіхалагічных дысцыплін, што, як нам здаецца, усё ж прадугледжана універсітэцкай адукацыяй.

Дысцыпліны правазнаўства таксама не ў пашане на многіх факультэтах. Далей за ўсіх пайшоў тут мехмат, які ад іх увогуле адмовіўся, матывіруючы тым, што сённяшнія законы занадта недасканалыя і няўстойлівыя, каб марнаваць на іх вывучэнне вучэбныя гадзіны.

Цяжкі час напаткаў і сацыяльна-палітычныя навукі. Не праяўляюць да іх павышанай увагі факультэты, а радыёфізікі вырашылі абыйсціся без іх.

А вось у ваеннай кафедры праблем з жадаючымі вучыцца няма, хоць студэнты і забяспечаны выбарам (за які, нагадаем, некалькі гадоў назад вельмі актыўна змагаліся). Аднак сёння прагматызм бярэ сваё: нават тым, хто не ўсхваляе патрыятычныя пачуцці, падаецца лепшым займацца вайсковай справай два гады раз на тыдзень, чымсьці потым два гады цягнуць лямку салдата.

Аляксандр ЮРЫН.

САКРЭТ ФІРМЫ

## СТЫПЕНДЫІ АД ПРЭЗІДЭНТА

***Прэзідэнт Расіі Барыс Ельцын выдаў распараджэнне, якое датычыцца памераў і парадку назначэння стыпендыі прэзідэнта РФ.***

Яны назначаюцца студэнтам і аспірантам вышэйшых навучальных устаноў, якія дасягнулі выдатных поспехаў у вучобе і навуковых даследваннях. Распараджэннем вызначаецца 700 стыпендый для студэнтаў і 300 — для аспірантаў, якія навучаюцца ў РФ. Для навучэнцаў за межамі вызначаецца 40 стыпедый для студэнтаў і 60 — для аспірантаў. Стыпендыі для навучэнцаў у РФ будуць выплочвацца з разліку 4 мінімальных памераў аплаты працы для студэнтаў і 5 — для аспірантаў. А для навучання стыпендыятаў за мяжой прадугледжваецца выдзяляць кожны год 2 мільёны долараў. Назначаць стыпендыі будзе Дзяржаўны камітэт РФ па вышэйшай адукацыі кожны год з 1 верасня на адзін год для студэнтаў і на тэрмін ад аднаго да трох гадоў для аспірантаў.

## ПАПРАЦУЕМ ПА-БРАТЭРСКУ

***Падобна на тое, што акадэмічная навука Беларусі ўсур'ёз вырашыла «пабратацца» з вучонымі — прадстаўнікамі вышэйшай школы.***

Аказваецца, сумесных праграм можа быць шмат, і сярод іх нямала цікавых. Пакуль жа спецыяльная камісія, якая аб'ядноўвае супрацоўнікаў Акадэміі навук Беларусі і Мінадукацыі Беларусі, займаецца падрыхтоўкай дакументацыі, а ў перспектыве мае намер адкрыць фонд фінансавання сумесных даследванняў і фонд падтрымкі выданняў навуковай, метадычнай і вучэбнай літаратуры, стварыць рэспубліканскі савет па каардынацыі навуковых даследванняў. У планах — правядзенне стажыровак вучоных і выкладчыкаў, прыняцце праграмы ўдзелу акадэмічных вучоных у рабоце вну і вузаўскіх навуковых даследванняў. Будуць таксама распрацаваны прынцыпы супрацоўніцтва з замежнымі фондамі, а з часам створаны спіскі прыярытэтных накірункаў сумесных даследванняў і цэнтр калектыўнага карыстання прыладамі і абсталяваннем.

## ПА ЧЫМ ЖУРНАЛІСТ З ДОБРАЙ РАДАСЛОЎНАЙ?

***Кошт студэнтаў казахстанскіх ВНУ пастаянна расце.***

Невядоа, наколькі гэта адпавядае попыту, але ў Казахстанскім дзяржаўным нацыянальным універсітэце поўны курс, навучання ўсходневеда і эканаміста-міжнародніка каштуе 3,2 мільёны рублёў. Матэматыкам і журналітам трэба заплаціць удвая менш. Ад 2 да 3 мільёнаў рублёў каштуе навучанне ў іншых сталічных ВНУ — медыцынскім, ветэрынарным, Акадэміі кіравання.

А вось атамна-энергетычны інстытут «падкачаў»: плата за навучанне на ўсіх факультэтах 740—750 тысяч рублёў. Гэта толькі ў тры разы больш, чым каштуе на сабачым рынку бультэр'ер ці далмацін з добрай радаслоўнай.

## РАЗ УНІВЕРСІТЭТ, ДВА...

***Раней студэнт Белдзяржуніверсітэта мог, не ўдакладняючы, паведаміць, што вучыцца ва універсітэце, а вось цяпер з'явілася пагроза не знайсці паразумення з субяседнікам.***

Кампанія па перайменаванню інстытутаў ва універсітэты і акадэміі прывяла да таго, што ў Мінску з'явіліся эканамічны і сельскагаспадарчы універсітэты.

Некалькі дзён таму перайменавалі і суседзяў па Плошчы незалежнасці — Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А. М. Горкага. Пасля падпісання адпаведнага загада ён стаў звацца Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэтам.

НЕ КАЧАГАРЫ МЫ, НЕ ЦЕСЛЯРЫ...

## БЕСПРАЦОЎНЫ НЕ ТОЛЬКІ ТОЙ, ХТО НЕ ПРАЦУЕ

Калі ў пачатку 1992 года 60 працэнтаў беспрацоўных складалі спецыялісты з вышэйшай адукацыяй, дык ужо напачатку 1993 іх колькасць паменшылася на 20 працэнтаў. Прыемны для ўсіх нас факт, таму што сведчыць ён аб набліжэнні да сусветных паказчыкаў. У развітых жа краінах колькасць беспрацоўных сярод высокакваліфікаваных спецыялістаў намнога ніжэй, чым сярод некваліфікаваных! Толькі радавацца рана...

***Пакуль што патэнцыяльным беспрацоўным можа лічыць сябе амаль кожны другі студэнт нашага універсітэта.***

**Кожнага студэнта, асабліва выпускніка, хвалюе яго будучыня ў сэнсе магчымасці ўладкавацца на працу, пажадана — па спецыяльнасці. Папаўняць войска беспрацоўных, маючы прэстыжны універсітэцкі дыплом, вельмі сумна. Але, як мы даведаліся ў студэнцкім сектары аддзела кадраў БДУ, з 2206 выпускнікоў у гэтым годзе працаўладкавана універсітэтам па спецыяльнасці 955. Большасць з гэтых шчаслівчыкаў (485 чалавек) атрымала накіраванне на працу па заяўках прадпрыемстваў, 78 чалавек — у адпаведнасці з заключанымі дамоўленасцямі. І больш за тысячу выпускнікоў атрымалі «святое» права самастойнага працаўладкавання, якое некалькі гадоў назад студэнты так настойліва заваёўвалі.**

**У гэтым жа годзе толькі 167 студэнтаў атрымалі свабодны дыплом па асабістай просьбе. 167 адважных, якія ў гэтым жыцці спадзяюцца толькі на сябе. Каля двухсот чалавек атрымалі свабодныя дыпломы па ўважлівых прычынах — камусьці трэба было ехаць дадому і дапамагаць хворым бацькам, хтосьці змяніў сямейнае становішча...**

**Гэтыя дыпламаваныя спецыялісты (і 167 адважных) нават не атрымаюць адразу статус беспрацоўных. Беспрацоўнымі ж могуць лічыцца 714 чалавек, якія атрымалі свабодны дыплом з-за адсутнасці працоўных месцаў. Напрыклад, з 326 выпускнікоў, падрыхтаваных факультэтам прыкладной матэматыкі, 215 — патэнцыяльныя беспрацоўныя. Няма месцаў. Здаецца працоўны рынак матэматыкамі ўжо перапоўнены, а Камароўцы хапае для задавальнення сваіх патрэб і звычайных асабістых калькулятараў. Відавочны тэхнічны прагрэс. Не ў лепшым становішчы і радыёфізікі: з 260 выпускнікоў 200 — атрымалі свабодны дыплом (з-за адсутнасці месцаў).**

Цікава, што нікому не спатрэбіўся ніводны палітолаг: 37 выпускнікоў, 37 свабодных дыпломаў і 37 патэнцыяльных беспрацоўных.

З 33 спецыялістаў-паліт-эканомаў толькі 16 атрымалі накіраванне на працу, з 25 філосафаў — толькі сем.

Са 165 выпускнікоў фізічнага факультэта (вытворчы паток) — 80 беспрацоўных, з 137 механіка-матэматычнага (таксама вытворчы паток) — 70.

Значна большым попытам карыстаюцца знаўцы беларускай мовы і літаратуры 126 выпускнўкоў і 111 з іх гарантавана працаўладкаванне.

А ў Рэспубліканскім цэнтры занятасці насельніцтва нас мала чым суцешылі. Патрабуюцца пакуль усё больш рабочыя без спецыяльнасці: прыбіральшчыцы, дворнікі, кіяскёры, банщчыкі, а таксама работнікі камбінатаў надомнай працы. Радзей — медыцынскія сёстры і санітары, маляры, эканамісты, бухгалтары са стажам. Адзінае, што змаглі нам параіць: займайцеся індывідуальнай працай, а яшчэ лепш — паспрабуйце сябе ва ўласным бізнесе: міні-кафэ, бутэрбродная і г. д.

Праўда, мы «ура» крычаць пакуль пачакаем, бо не верым, што вуліцы і посуд у сталоўках стануць чысцейшымі ад таго, што займацца імі будуць маладыя, энергічныя людзі (а менавіта моладзь складае па рэспубліцы 3,3 працэнта беспрацоўных), ды яшчэ з універсітэцкімі дыпломамі ў кішэнях. Што ні кажыце, шкада, калі з цягам часу дыпламаваныя «бутэрброднікі» і «камерсанты» забудуцца на сваю вышэйшую адукацыю, як забудзецца на іх і дзяржава, таму што наступны год рыхтуе новае папаўненне для той катэгорыі насельніцтва, якая прызвычаілася ўжо да пужаючага раней эпітэту — беспрацоўны.

***Адзін мой знаёмы часова працуе дворнікам. Можа прыбіраць, можа не прыбіраць. А з кішэні яго рабочай вопраткі выглядвае ўжо даволі пацёрты дыплом.***

**Таццяна КАЗАК.**



## УСЕ НА КІРМАШ — ПРАДАЕЦЦА ПРАЦА

***Напачатку верасня ў Мінскім палацы культуры чыгуначнікаў адбыўся Кірмаш рабочых вакансій.***

Сотні прагнучых знайсці або змяніць месца працы запоўнілі прасторныя холы.

Рэспубліканскі цэнтр занятасці насельніцтва ладзіў гэты кірмаш, каб прыцягнуць свабодныя працоўныя рукі да вытворчасці. Былі жадаючыя знайсці працу, былі, зразумела, і людзі, якія гэтую працу маглі прапанаваць.

Але, і гэта прыкмета часу, войска беспрацоўных няўмольна расце: ва ўсякім выпадку, па дадзеных Рэспубліканскага цэнтра занятасці насельніцтва за 1-ае паўгоддзе 1993 года ў дзяржаўную службу занятасці звярнулася ў 1,1 раза больш жыхароў рэспублікі, чым за такі ж тэрмін мінулага года.

Звяртаецца ўвага на тое, што за гэты тэрмін скарачаэнне адбылося практычна ва ўсіх галінах эканомікі, невялікае павелічэнне назіраецца толькі ў сферы кіравання, крэдытавання, страхавання, адукацыі і жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

НАС ПАПЯРЭДЖВАЮЦЬ

## ДЫФТЭРЫЯ КРОЧЫЦЬ ПА СТАЛІЦЫ

***У апошнія дні жніўня калідоры 33-й студэнцкай і універсітэцкай палікнікі, якія дагэтуль доўгі час пуставалі, адразу запоўніліся вялікімі чэргамі.***

***Незарэгістраваны медслужбай «вірус» аднаго за другім «касіў» другакурснікаў універсітэта.***

**У выніку: тых, хто павінен быў працаваць на палетках калгасаў і саўгасаў, але з-за хранічнай хваробы вызвалены ад гэтага пачэснага працоўнага абавязку, налічваецца ў сёлетні «бульбяны» сезон 85 чалавек.** Без уважлівых прычын не паехала значна больш. Пэўна, не ўстаялі перад «вірусам» боязі сельгасработ.

Але, шчыра кажучы, больш хвалююць медыцынскіх работнікаў іншыя лічбы. Сёлета ў Мінску вельмі неспрыяльная медыцынская абстаноўка. Скажам, за першае паўгоддзе зарэгістравана 37 форм інфекцыйных захворванняў, прычым з некаторымі з іх медыцыне даўно ўжо не даводзілася сутыкацца. Толькі за ліпень у сталіцы выяўлена 19 выпадкаў дыфтэрыі (адзін са смяротным зыходам), калі за ўвесь 1992 год такіх выпадкаў было 18.

Хвалюючыся аб стане здароўя пад ас «бульбяного» месяца, многія студэнты абыякава ставяцца да штогадовага медыцынскага абследавання, рэгулярнага праходжання флюараграфіі (у гэтым годзе, нягледзячы на ўсе намаганні медыкаў і звароты ў дэканаты, яе прайшлі толькі 43,5 працэнта ад агульнай колькасці навучэнцаў універсітэта).

Дактары папярэджваюць: жартаваць з уласным здароўем вельмі небяспечна.

**Аляксадр ЮРЫН.**

# «ЛАСЬЁНАЎ АД АБЛЫСЕННЯ МЫ НЕ АБЯЦАЕМ, АЛЕ»...

*З сакавіка 1990 года існуе ў Мінску камп'ютэрна-дыягнастычны цэнтр «БелНІКА». Створаны ён нашымі звычайнымі ўрачамі, якія працавалі ў самых звычайных бальніцах і атрымлівалі звычайную зарплату. Але штосьці ва ўсім гэтым — ну трэба ж! — ім не спадабалася...*

*Сёння камп'ютэрна-дыягнастычны цэнтр — гэта прэстыжная ўстанова для замежных кліентаў, для людзей якія клапоцяцца аб сваім здароўі. Як растлумачылі мне Віктар Вячаслававіч МІКАЛАЕЎ і Алег Ільіч ЛАШКОЎ, цэнтр займаецца камп'ютэрай дыягностыкай і лячэннем па метаду нямецкага ўрача — стаматолага Рэйнхальда Фоля. Метад Фоля — гэта сімбіёз старадаўняй кітайскай і сучаснай еўрапейскай медыцыны. Гэты метад знаёмы навуцы яшчэ з 1953 года. Заснаваны ён на тым, што на кожны орган арганізму чалавека можна ўздзейнічаць праз пэўныя кропкі на яго целе. Рэйнхальд Фоль адкрыў 800 такіх кропак. Акрамя таго, падчас аднаго з вопытаў Фоль са сваім вучнем заўважылі, што лекі, якія пацыент яшчэ не прымаў, але трымае ў руках, пачынаюць уздзейнічаць на яго.*

*Але сёння мы жадаем даведацца аб уздзеянні на чалавека касметычных прэпаратаў. Аказваецца, кожнаму з нас патрэбны індывідуальны падыход да падбору касметыкі і парфумы. І, як сцвярджае Віктар Вячаслававіч:*

— ...на захадзе ён існуе ўжо дзесяткі гадоў. Такая ўважлівасць да сябе абыходзіцца, канешне, у 10 разоў даражэй, але прыходзіцца выбіраць: альбо вазелін маркі «Кастрычнік», альбо нармальная касметыка.

**— А чым абумоўлена неабходнасць індывідуальнага падыходу?**

— Справа ў тым, што любое матэрыяльнае цела: лекі, мікробы, метал і г. д.— уплываюць на кожнага чалавека па-рознаму. Аднаму яно прынясе карысць, другому пашкодзіць, а на трэцяга, увогуле ніяк не паўплывае. Але нават калі ўздзеянне будзе са знакам «плюс», не трэба захапляцца. Растлумачу на вельмі простым прыкладзе. Медзь спрыяе дзейнасці наднырачнікаў, але пры працяглым яе ўплыве дзейнасць наднырачнікаў можа быць прыгнечана. Гэты прынцып працуе і ў фармакалогіі, і ў касметалогіі. У Японіі не выпісваюць пагалоўна пажыццёвыя медныя бранзалеты.

**— А як жа прадукцыя кампаніі «*PiC*», якая паляпшае жыццё людзей ва ўсім свеце, ці «Джонсан і Джонсан», што клапоціцца аб нашым здароўі? Гэта што — фікцыя?**

— Не, іх прадукцыя сапраўды якасная, тэхналагічна вытрыманая, у яе склад уваходзяць экалагічна чыстыя і эфектыўныя інгрэдыенты, але ўсё гэта яшчэ не азначае, што такая прадукцыя для вас. Парадокс? Так. Але зараз ва ўсім свеце ідзе працэс алергізацыі насельніцтва. Гэта звязана з урбанізацыяй, з ужываннем розных дабавак. І на сённяшні дзень больш канкрэтна ніхто нічога не ведае. Алергію ў вас можа выклікаць любая, нават самая якасная прадукцыя. Тое ж самае мыла «САМАv» пры доўкім ужыванні, назапашваючы на вашай скуры рэчывы, якія вызываюць у вас алергію, дасць адмоўную рэакцыю.

**— А што можна параіць жанчынам, у якіх няма часу звярнуцца за кансультацыяй да вас? Як ім выбраць сабе касметыку ў нашых крамах?**

— Нічога. Усё толькі індывідуальна. Праўда, адкрыю вам маленькі сакрэт, сумеснае беларуска-італьянскае прадпрыемства «Беліта» закупіла абсталяванне для выпуску дробных партый касметычных прэпаратаў. Некаторыя з іх абяцаюць быць унікальнымі. Прэпараты гэтыя будуць распрацаваны на аснове тэсціравання нашых жанчын, яны будуць прыстасаваны да нашых кліматычных умоў. Бо нават сённяшнія крэмы «Беліты», што гатуюцца з якаснай італьянскай сыравіны, не падыходзяць нашым жанчынам. Італія — гэта сонца, мора, многа солі ў паветры, зусім іншая ежа і вобраз жыцця. Будуць таксама адкрывацца пункты індывідуальнага падбору касметыкі накшталт салона-цырульні «Беліты» на плошчы Якуба Коласа.

Наш цэнтр сумесна з галоўным тэхнолагам «Беліты» распрацаваў методыку стварэння касметычных прэпаратаў падвойнага уздзеяння. З іх дапамогай можна будзе ўплываць не толькі на знешні выгляд, але і на стан унутраных органаў. Мы адмаўляемся ад традыцыйнага савецкага падыходу: у вас дрэнныя валасы, таму што ў вас у арганізме нешта не ў парадку. Ласьёны ад аблысення мы, канешне, не абяцаем...

**— Але лячыць з дапамогай касметычных прэпаратаў паспрабуеце?**

— Любіце вы ўсё гэдакае, толькі скажы неасцярожна! Зразумела, не лячыць, а толькі паляпшаць агульны стан. Хаця ў адной з нашых кліентак, якой мы падабралі індывідуальны набор касметыкі, палепшылася і здароўе.

**— Індывідуальны набор касметыкі — гэта, напэўна, вельмі дорага?**

— Лічыце самі. Два-тры розных тыпа крэмаў: дзенны, вячэоні, пажыўны (усяго 6 флаконаў) каштуюць 30 тысяч рублёў. І гэтыя крэмы з дапамогай пэўных тэстаў і камп'ютэра падабраны менавіта да вашай скуры.

**— Здаецца мне, што ў хуткім часе трэба чакаць закрыцця ўсіх касметычных і парфумных фабрык былога Саюза — жанчыны адмовяцца купляць касметыку, якая выпускаецца для шырокага карыстання.**

— Гэтага не адбудзецца хаця б па той прычыне, што асноўная маса людзей у нас яшчэ абыходзіцца гаспадарчым мылам. (Нядаўняя дэлегацыя з Узбекістана жадала закупіць у нас яго рэцэпт). Людзі яшчэ не жывуць так, каб індывідуальна падбіраць сабе нават лекі, што, зразумела, больш важна.

Мы арыентуемся на заможных людзей. Не дзіўна — ва ўсім свеце індывідуальны падбор касметыкі — вельмі дарагая справа, разлічаная далёка не на ўсе слаі насельніцтва.

**— Прабачце, калі ласка, я канешне, чалавек сціплы, але мой службовы абавязак вымушае задаць наступнае пытанне. Вас ніколі не абвінавачвалі ў шарлатанстве?**

— Ведаеце, сярод тысячы людзей заўсёды знойдзецца адзін не задаволены... Але нават гэтыя незадаволеныя не выстаўлялі нам сур'ёзных прэтэнзій. Галоўная іх скарга — недастатковая эфектыўнасць нашага метаду, не такая, якой яны чакалі. Наша ж методыка афіцыйна прызнана не толькі нашымі, але і замежнымі медыкамі. Сярод нашых пацыентаў ёсць нават міністры.

**— Ну, калі міністры, тады прабачце яшчэ раз. І дзякуй вам вялікі за цікавую размову.**

**Гутарыла Вольга УЛЕВІЧ.**



# НЕ БОГІ Ў ФУТБОЛ ГУЛЯЮЦЬ



6 верасня ў Мінску ўсё ж такі адбылося канцэртна-футбольнае шоў з удзелам зорак расійскай эстрады. І трэба сказаць, што 15 тысяч мінчан нават і не сумняваліся ў яго рэальнасці. Каманда «Старко» выйшла на поле не зусім каб у «зорным», але неблагім складзе. Шкада, канешне, лепшага форварда каманды Сяргея Крылова, прыехаць якому перашкодзілі неадкладныя справы ў Штатах, і Юрыя Антонава, які не змог адолець цяжкасцей расійскіх дарог. Але Прэснякоў — малодшы і Аляксей Глызін усё ж такі прарваліся праз чэргі ў аэрапорце і нялётнае надвор'е ў наш родны «Мінск-2» і, што яшчэ больш неверагодна, прадэманстравалі добрую гульню ў другім тайме. Яшчэ адна зорная парачка — Сяргей Мінаеў і Міхаіл Мурамаў — увесь час мужна абаранялі левы і правы флангі. Трохі далей тусаваліся Барыкін, Місін, Кулікоў і трэнер Валерый Гладзілін, які таксама выйшаў на поле. Непераўзыдзеным нападаючым расійскай каманды быў Уладзімір Прэснякоў — старэйшы, якога трыбуны падчас скандзіравання ахрысцілі Пятровічам. Безумоўна, яму, Пятровічу, належыць прыз глядацкіх сімпатый. Хаця нашаму фотакарэспандэнту найбольш спадабаўся яго сын.

Хросным айцом мінскай каманды з усёй адказнасцю можна назваць арганізатара канцэртна-футбольнага шоў, у былым вядомага футбаліста мінскага «Дынама», а сёння ўдачлівага бізнесмена Людаса Румбуціса. У складзе яго каманды ігралі прадстаўнікі малога і сярэдняга бізнесу, банкіры, спартыўныя журналісты і нават дэпутаты. Прычым, як даведаліся мы з неафіцыйных крыніц, за выхад на поле кожнага іграка каманда мінскіх бізнесменаў павінна была заплаціць 2 мільёны камандзе праціўніка...

Суддзёй на полі быў абраны мэр горада Маладзечна народны дэпутат Генадзь Карпенка. Лік адкрылі госці. Але ў другім тайме мінчане выйшлі ў новым складзе і, дзякуючы прафесійнай і ўпэўненай гульні былых дынамаўцаў Румбуціса і Аляксейчыкава, узялі ініцыятыву на сябе. Стала горача... І вось у паслематчавым пенальці пры ліку 4:4 да мяча набліжаецца Румбуціс і ўпэўнена... пасылае яго ў рукі варатара. (Потым, у адной асабістай размове, ён прызнаўся, што зрабіў гэта з высакародных памкненняў: не хацеў засмучаць гасцей і глядачоў, якія, зразумела, балелі не за айчынных бізнесменаў). Магчыма, гэтая акалічнасць так натхніла расійскіх зорак, што яны здолелі завесці ўвесь сталічны стадыён нават пад фанаграму.

Дарэчы, Людас Румбуціс таксама мог заспяваць, і ў адрозненні ад Прэснякова-малодшага са сцвярджальнай інтанацыяй: «Я не ангел, я не бог...». Але чамусьці не захацеў.

# РАБОТА БУДЗЕ. БЫЛА Б ГАЛАВА НА ПЛЯЧАХ

***Ёсць такая супольнасць людзей — вучоныя-практыкі. Яна невялікая, бо нямногія імкнуцца туды трапіць, асабліва ў апошнія гады. Але і не кожнага жадаючага яна прымае — пропускам не заўсёды служыць і дыплом з універсітэцкай адукацыяй, і нават высокае навуковае званне...***

Сярод дзесяці кафедраў фізічнага факультэта ёсць і кафедра біяфізікі. Цікавасць да яе з боку студэнтаў факультэта расце — біяфізіка ж навука яшчэ маладая, а значыць, мае вялікія перспектывы.

У недалёкім мінулым загадчык кафедры Сяргей Мікалаевіч Чаранкевіч падтрымаў імкненне маладога дактаранта Аляксандра Вікенцьевіча Цімашэнкі да распрацоўкі ўласнай навуковай тэмы. Праявілі цікавасць да яе і нямецкія спецыялісты. Ужо больш года сумесна з нямецкімі вучонымі займаецца Аляксандр Вікенцьевіч рэалізацыяй беларуска-германскай праграмы даследвання біяфізікі клеткі. Зараз вывучаюцца новыя лекавыя рэчывы для лячэння анкалагічных захворванняў. Дарэчы, фіннасаванне ўзяў на сябе фонд вядомай фірмы «Фольксваген». Дзякуючы рэалізацыі сумеснай праграмы, Беларусь атрымлівае навейшыя навуковыя дадзеныя па анкалагічных захворваннях і метадах іх лячэння. Наколькі патрэбна гэта нашай рэпубліцы — залішне і казаць. Гэта ж дае магчымасць кафедры набываць патрэбнае абсталяванне і прэпараты.

Не менш цікавыя распрацоўкі вядуцца і ў лабараторыях, якія знаходзяцца пры кафедры. Лабараторыяй біяфізікі і біятэхналогіі кіруе старшы навуковы супрацоўнік Уладзімір Пятровіч Зорын. З групай супрацоўнікаў ён займаецца вывучэннем фотадынамічнай тэрапіі злаякасных пухлін. Пра гэта даследванне больш падрабязна расказаў мне супрацоўнік лабараторыі, аспірант кафедры біяфізікі Іосіф Міхалоўскі;

— У жывы арганізм шляхам ін'екцыі ўводзіцца спецыяльнае адчувальне да святла рэчыва, якое атрымліваецца са звычайнай зялёнай лістоты, прычым выпрацоўваюцца такія рэчывы, якія ў асноўным захопліваюцца пухлінай. Затым на злаякасную тканку накіроўваецца бачнае святло. Пад яго ўздзеяннем рэчыва ўзбуджаецца і генерыруе актыўныя формы кісларода, якія пашкоджваюць мембраны клетак пухлінных тканак.

Механізмы ўздзеянняў актыўных рэчываў са злаякаснай тканкай падрабязна вывучаюцца намі на клеткава-малекулярным узроўні. Нашы даследванні, дарэчы, праходзяць сумесна з БелНДІ анкалогіі і эксперыментальнай радыялогіі. Трэба дадаць, што падобны метад лячэння некаторых анкалагічных захворванняў ужо практыкуецца на Захадзе.

Аляксадра Барысаўна Самаль, старшы навуковы супрацоўнік лабараторыі біяфізікі і біятэхналогіі, зараз займаецца вывучэннем уплыву полісахарыдаў на функцыянальную актыўнасць трамбацытаў (клеткі крыві, якія ўдзельнічаюць у некатоых фізіялагічных працэсах, да прыкладу, у працэсе згортвання крыві). Трамбацыты, у сваю чаргу, маюць адносіны да механізмаў ішэмічнай хваробы сэрца і інфаркту міякарда.

— Полісахарыды ў хуткім часе могуць стаць шырокаўжываьнымі лекамі ў кардыялогіі,— гаворыць студэнтка V курса фізфака Алена Согрына, якая таксама вывучае гэтую тэму.— Аднак спачатку трэба высвятліць магчымыя пабочныя эфекты, якія яны могуць аказаць на арганізм чалавека. Доследы паказалі, што полісахарыды аказваюць уплыў на агрэгацыю трымбацытаў і згортванне крыві...

На заканчэнне нашага знаёмства з кафедрай біяфізікі прывяду ўрывак з гутаркі з яе загадчыкам:

**— Сяргей Мікалаевіч, што ўсё ж такі ўяўляе сабой біяфізіка ў навукова-практычным сэнсе?**

— Біяфізіка вывучае фізічныя з'явы ў жывых сістэмах. З яе дапамогай удалося ўстанавіць структуру і ўласцівасці важнейшых палімераў, мембраны клетак, а таксама іншыя з'явы жывой прыроды. Вынікі біяфізічных даследванняў шырока ўжываюцца, у прыватнасці, у медыцыне, біятэхналогіі, нават камп'ютэрнай тэхніцы. Наша кафедра праводзіць шмат даследванняў: па стварэнню біясэнсараў, новых элементаў пераўтварэння інфармацыі з выкарыстаннем біяпалімераў, біячыпаў — элементаў для камп'ютэраў новага пакалення (сумесная распрацоўка з кафедрай фізікі паўправаднікоў) і іншыя. Лічу значнымі вынікі работ па вывучэнню механізмаў функцыяніравання імунакампетэнтных клетак, працэсаў узаемадзеяння віруса грыпу з клеткамі, яшчэ цэлага шэрагу з'яў у сістэме крыві чалавека.

Мы актыўна супрацоўнічаем з многімі інстытутамі Акадэміі навук, навуковымі установамі Міністэрства аховы здароўя. Наладжаны кантакты з Люблінскім універсітэтам у Польшчы, з Мюнхенскім універсітэтам у Германіі:

**— Якім жа чынам удзельнічаюць у навукова-даследчай рабоце вашай кафедры студэнты?**

— Практычна ўсе яны на старэйшых курсах далучаны да навуковай работы. І не толькі ў лабараторыях нашай кафедры, але і ў іншых навуковых установах Мінска. На момант абароны дыпломных работ многія выпускнікі маюць уласныя публікацыі. Таму ўжо колькі год кафедра не мае праблем з размеркаваннем.

**Аляксандр ЮРЫН.**

# ВЫПІЦЬ КУБАЧАК «КОФА»

***Існуе старадаўняя легенда, згодна з якой яшчэ ў XI стагоддзі эфіопскія пастухі акругі Каффа заўважылі, што козы робяцца надзвычай ажыўленымі, калі ядуць лісце аднаго хмызняку. Значна пазней людзі даведаліся, што галінкі гэтага хмызняку валодаюць яшчэ больш танізуючым уздзеяннем.***

Легенда не маніць. Нават сёння ў далёкай і цяжкадаступнай горнай Каффе, ад якой і пайшла назва напітку, растуць дзікія дрэвы кавы. Вырошчваць жа іх першымі пачалі бліжэйшыя суседзі эфіопаў — сяляне Йемена. Йеменцы вывелі шмат новых гатункаў кавы, сярод якіх і малаўрадлівы Мокка. Малаўрадлівы, але не мае роўных па сваіх смакавых якасцях! Болей 200 гадоў Йемен быў адзінай краінай, што пастаўляла каву на сусветны рынак. Так працягвалася да таго часу, пакуль галандскія маракі не выкралі некалькі дзесяткаў саджанцаў кававага дрэва і не сталі вырошчваць яго ў сваіх калоніях — краінах Паўднёва-Усходняй Азіі. Гандаль кавай прыносіў вялікія прыбыткі.

Распаўсюджванню кавы спрыялі купцы-бедуіны, якія, гандлюючы кававымі зярнятамі, запрашалі бясплатна выпіць кубачак кавы, вучылі, як падсмажыць і здрабніць зярняты. Аматары кавы рассаджваліся прама на гандлёвых плошчах на стракатых дыванах пад ценем густой чынары з асалодай пілі каву, нацягвалі кальян і слухалі павольныя апаведы купцоў аб невядомых краінах. Дарма муэдзін з высокага мінарэта заклікаў іх да малітвы. Святары не маглі згадзіцца з такой з'явай і ўчынілі расправу: Сабор заканадаўцаў 1511 года ў Мекке выказаў свой праклён «чорнаму афрыканскаму зеллю». Правіцель Хаір-бей у славу Карана забараніў піць каву, як узбуджальны напой, выгнаў купцоў, спаліў усе кававыя зярняты. Упартая барацьба працягвалася 200 гадоў, але кававы напітак працягваў заваёўваць краіну за краінай.

Пасол Папы Рымскага Дэлла Валле падчас пражывання ў Іране прыахвоціўся да кавы і па вяртанні ў Венецыю ў 1646 годзе адкрыў там першую ў Еўропе кавярню.

У 1652 годзе адкрываюцца першыя кавярні ў Лондане, а ў 1683 у сталіцы Брытанскага Каралеўства іх ужо болей за 3 тысячы. А ў 1696 годзе, захапіўшы востраў Цэйлон, Англія пачала вырошчваць там кававыя дрэвы, выкарыстоўваючы ў якасці працоўнай сілы мясцовых жыхароў.

У хуткім часе кававая «ліхаманка» перакінулася і на Амерыканскі кантынент. Гандаль духмяным «напоем жыцця» прыносіў неверагодныя прыбыткі.

Першы рэцэпт гатунку кавы прывёз у Расію з Галандыі Пётр I. Імпарт кавы ў Расію павялічваўся з кожным годам. У 1802 годзе было закуплена кававых зярнят на суму 1.056.967 рублёў. У 1913 — імпарт у Расію склаў 772 тысячы пудоў (болей за 12 тысяч тон).

***Тым, каго не напужаеш ні папярэджваннямі, ні легендамі, якія цягнуцца за дзівосным напоем са старадаўніх часоў, прапануем некалькі кампетэнтных парад.***

Перш за ўсё, кававыя зярняты павінны быць свежападсмажанымі — настолькі, наколькі вам падабаецца гаркаваты прысмак кавы. Малоць зярняты на запас нельга — пасля памолу кава губляе свой водар не па днях, а па гадзінах. Звычайная колькасць молатай кавы для аднаго кубачка — 12 грамаў на 180 кубічных сантыметраў вады, для падвойнага мацунку — на 90. Вада павінна быць чыстай, без усялякіх пахаў. Празмерна хларыраваную ваду неабходна вытрымац некалькі гадзін у адкрытым посудзе. Самае галоўнае — каву не вараць, а заварваюць. Паклалі ў кіпень кававы парашок — адразу здымайце турку з агню.

**Кава «Араб».** У турку засыпаюць адну чайную лыжку цукру і ставяць на агонь, каб цукар пачаў карамелізавацца (плавіцца). Калі цукар прыме карычневую афарбоўку, у турку наліваюць вады і даводзяць да кіпення. Здымаюць з агню, засыпаюць 7—10 грамаў кавы на 100 мл вады, зноў ставяць на агонь да моманту кіпення. Пасля непрацяглага адстойвання каву разліваюць. Карамелізаваны цукар надае ёй асабісты смак. Цукар дабаўляюць па густу.

**Мурмуровая.** Гэта не толькі смачны, але і прыгожы напітак. Гатуюць яго так: цёплае малако ў невялікай колькасці наліваюць на дно кававага кубачка, а затым асцярожна дабаўляюць каву. Перамешваць напітак не трэба.

**З яйкам.** Для прыгатавання чатырох порцый спатрэбіцца адно яйка і чатыры кубачкі моцнай гарачай кавы, жаўток яйка расціраюць з дзвюма лыжкамі цукровай пудры, бялок узбіваюць з дапамогай міксера. На паверхню ў кожны кубачак кладуць жаўток, а калі ён разыйдзецца, у цэнтры — узбіты бялок.

**Кава па-арабску.** У турку ёмістасцю 100 мл. пакласці кавалачак цукру, наліць на 3/4 халоднай вады і паставіць на агонь. Калі вада ўскіпіць, турку здымаюць і засыпаюць 5—8 грамаў кавы. Размешваюць і зноў ставяць на агонь, даводзяць на кіпення. Зняўшы з агню, даліваюць вады і зноў даводзяць да кіпення.

Дарэчы, знакамітую каву па-усходняму прынята падаваць са шклянкай звычайнай халоднай вады. Невялічкія глыткі кавы трэба запіваць вадой, каб лепш адчуць смак і водар дзівоснага напою. Яшчэ больш спакусліва выглядаюць рэцэпты халоднай кавы.

**Узбітая.** Перамешваюць кубачак моцнай халоднай кавы з дзвюма лыжкамі згушчанага малака і ваніллю. Сумесь узбіваюць на міксеры. У шклянкі кладуць кавалачкі льду, наліваюць каву.

**Балгарская.** Добра перамешваюць кубачак кефіру і такі ж кубачак кавы: 5 лыжак цукру і сталовую лыжку вяршкоў. Разліваюць сумесь па шклянках, перад ужываннем на некаторы час ставяць у халадзільнік.

**Венская.** У шклянку з ледзяной вадой дабаўляюць 2 сталовыя лыжкі распушчальнай кавы і сталовую лыжку малака. Усё перамешваюць і ўзбіваюць на міксеры. Разліваюць у шклянкі, зверху кладуць узбітыя вяршкі. Перад ужываннем таксама вытрымліваюць у халадзільніку.

Паспрабуйце хаця б адзін з гэтых рэцэптаў — вы здзівіцеся самі і прыемна здзівіце сваіх гасцей.

**ВЫ ЧУЛІ?**

## МЫ ВЫБІРАЕМ? НАС ВЫБІРАЮЦЬ!

*Польскія псіхатэрапеўты сцвярджаюць, што існуе пэўная сувязь паміж рысамі характару чалавека і яго вушамі.*

*МАЛЕНЬКІЯ ВУШЫ, лічаць яны, гавораць аб легкадумнасці, жывым характары, вострым, але неглыбокім розуме.*

*ВУШЫ ВЯЛІКІЯ — болей за 7 см па вышыні — належаць людзям, якія надзелены вялікай «прабіўной» сілай, упэўнены ў сабе.*

*ВУШЫ ВЫЦЯГНУТЫЯ Ў ДАЎЖЫНЮ гавораць аб далікатнасці, уражлівасці, рамантычнасці натуры.*

*ШЫРОКІЯ — прыкмета сілы характару, цвярозага розуму, рэалізму.*

*ВУШЫ, ЯКІЯ МОЦНА ПРЫЦІСНУТЫ ДА ГАЛАВЫ, ВЫВЕРНУТЫ НАЗАД, указваюць на ўзбудлівасць нервовай сістэмы, непрадказальнасць рэакцыі, нездаровую эмацыянальнасць.*

*«АБЛАВУХАСЦЬ» жа, выдае чалавека ўражлівага, які вельмі тонка адчувае настрой субяседніка.*

*ВЯЛІКАЯ МОЧКА сведчыць аб фізічнай і духоўнай сіле.*

*Нават калі назіранні польскіх псіхатэрапеўтаў вам не спадабаліся, не засмучайцеся. Бо не вы, у рэшце рэшт, выбралі сабе вушы, а — яны вас.*

# Я ХАЦЕЎ УЕХАЦЬ У ГОРАД НА БЕЛЫМ КАНІ

***Бывае так, што толькі нябачная мяжа адрознівае дрэнныя рысы вашага характару ад добрых — нахабнасць ад таварыскасці, жаданне ўсё пра ўсіх ведаць ад дапытлівасці, упартасць ад настойлівасці. Як разабрацца ў сабе?***

***Гэты тэст «Ці агрэсіўныя вы?» павінен дапамагчы змадэліраваць вашы паводзіны ў розных сітуацыях. Выбярыце адзін з трох прапанаваных адказаў.***

**1. Як вы рэагуеце, калі вас пакрыўдзяць?**

а) гэта вас не турбуе, таму вы не рэагуеце;

б) адразу пераходзіце ў контратаку,

в) хаця вам гэта і неабыякава, вы пазбягаеце дзеянняў ў адказ.

**2. Як вы сябе паводзіце, калі трапляеце ў аўтамабільную пробку?**

а) пачынаеце лаяцца ў адрас іншых шафёраў, і ад гэтага вам становіцца лягчэй;

б) упадаеце ў адчай, у вас з'яўляецца жаданне ўсё кінуць і ісці пешшу;

в) у вас гэта выклікае раздражненне.

**3. Ці адбываюцца сваркі ў вашай сям'і?**

а) рэдка, а калі і бываюць, то без скандалаў;

б) яны заўсёды жудасныя, з крыкамі, на высокіх танах, з бразганнем дзвярыма і жорсткімі абвінавачваннямі;

в) яны прыносяць змены ў вашы адносіны на доўгі час.

**4. Калі ў сяброўскай кампаніі ўзнікла спрэчка, то вы з тых, якія...**

а) жадалі б выказаць сваё меркаванне. Але сароmeецеся і аддаеце перавагу маўчанню, хаця і не згодны з канчатковым вынікам;

б) пазбягаеце спрэчак заўсёды, калі ёсць магчымасць гэта зрабіць;

в) выказваеце свае меркаванні, прыводзіце аргументы і імкнецеся давесці сваю думку да ўсіх, нават калі для гэтага прыходзіцца павышаць голас.

**5. Калі б вам давялося акрэсліць свой характар, што б вы сказалі?**

а) вы спакойны і прыемны чалавек;

б) вы прынцыповая і патрабавальная натура;

в) вы таварыскі чалавек.

**6. Як вы трымаецеся, калі жудасна раззлаваны?**

а) вы вельмі рэдка бываеце раз'юшанымі і заўсёды імкнецеся захоўваць спакой;

б) здольныя на ўсё, даеце волю сваёй фізічнай і моўнай агрэсіўнасці».

в) вы з тых, хто толькі ўздымае пары, але нічога не робіць.



**7. Як вы рэагуеце, клі хтосьці памыліўся, а гэта адбіваецца на вас?**

а) спрабуеце аблаяць яго за памылкі і кажаце, што памылкі ён павінен выправіць сам;

б)-моўчкі імкнецеся выправіць памылкі;

в) абмяркоўваеце здарэнне з віноўнікам, вызначаеце прычыны і шукаеце магчымасць выправіць справу.

| ВАРЫЯНТ адказ | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| а | Б | А | Б | В | Б | Б | А |
| б | А | В | А | Б | А | А | В |
| в | В | Б | В | А | В | В | Б |

**ВЫНІКІ:** Каб класіфікаваць вынікі, выкарыстоўвайце табліцу. Прыклад — калі на пытанне ... 1 вы далі адказ а), то атрымліваеце адзнаку Б, а калі адказалі варыянтам б), то атрымліваеце адзнаку А... Па колькасці вялікіх літар (адзнак) вы зможаце вызначыць сваю агрэсіўнасць. Чым больш будзе аднолькавых літар, тым больш падобны ваш характар да прапанаванага варыянту.

### ПЕРАВАГА АДЗНАК «А»

У вас вялікая схільнасць да моўнай і фізічнай агрэсіўнасці. Людзі накшталт вас кідаюцца прадметамі, калі раз'юшаны, б'юць кулакамі па сталу і бразгаюць дзвярыма. Нават здольныя перайсці ў рукапашную. У любым выпадку яны прыпыняюць кантроль за сваёй мовай. Вам не варта ганарыцца, калі вы належыце да такіх асоб.

### ПЕРАВАГА АДЗНАК «Б»

Агрэсіўнасць вам чужая. Нават калі вы злуеце, умееце стрымліваць сябе. Адна заўвага: такія паводзіны — таксама крайнасць. Вас могуць палічыць мяккацелым, слабахарактарным і няздольным пастаяць за сябе.

### ПЕРАВАГА АДЗНАК «В»

У вас ёсць пэўны зарад агрэсіўнасці, які вы імкнецеся кантраліраваць, але часам, калі вы меней за ўсё гэтага жадаеце, ваша агрэсіўнасць прыводзіць да выбуху. Будзьце ўважлівымі: ваша агрэсія можа выліцца на тых, хто гэтага менш за ўсё заслугоўвае.

ЧАСОПІС «ЭЛЬ ПАІС», МАДРЫД.

Калі вы не жадаеце адказваць на такую колькасць пытанняў, але не супраць даведацца аб сваёй агрэсіўнасці, прапануем вам скарочаны варыянт тэксту.

1. Вы хацелі ўехаць у горад на белым кані?

а) хацеў, але ўстрымаўся.

Вы вельмі агрэсіўны чалавек, але прыродная сціпласць і тактоўнасць дапамагаюць вам у крытычных сітуацыях.

б) не хацеў, а калі б і захацеў, то не ў свой.

Вы чалавек не зусім агрэсіўны. А магчыма, баіцеся. А хутчэй за ўсё, на кані ездзіць увогуле не ўмееце.

в) нават не задумваўся

І не трэба, у вас усё роўна нічога не атрымаецца — вы увогуле пазбаўлены агрэсіўнасці.

Газета «Беларусі універсітэт», Мінск.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

220079, 1-ы Загарадны зав., 3.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВНА імя Я. Коласа.

17 верасня
Зак. 1707.
Т. 1000 экз.

*220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ. 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.*
*ТЭЛЕФОН 20-68-27.*

Рэдактар
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.